Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования «Барановичский государственный университет»

Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования
«Тамбовский государственный университет имени Г. Р. Державина»

# СПЕЦИАЛИСТ XXI ВЕКА: ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ КУЛЬТУРА И ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

Сборник материалов V Международной
научно-практической конференции

(Барановичи, 20—22 октября 2016 года)

Репозиторий БарГУ

Барановичи
БарГУ
2016

УДК 001(063)

Включены материалы докладов V Международной научно-практической конференции «Специалист XXI века: психолого-педагогическая культура и профессиональная компетентность» по актуальным проблемам следующих научных дисциплин и направлений: психология, педагогика, филология, лингвистика и методика преподавания иностранных языков, человек в обществе, организация здоровьесбережения, обучение, воспитание и развитие дошкольников.

Адресовано преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, Н. Ф. Захарченя (отв. секретари),
Е. А. Клещёва, Е. Ф. Нестер, К. С. Тристень, А. В. Демидович, Е. И. Белая, О. Н. Фенчук,
И. В. Пинюта, А. А. Савко

Рецензенты:

доктор психологических наук, профессор Я. Л. Коломинский,
кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры русской и зарубежной литературы учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» О. Е. Панькова

**ISBN 978-985-498-740-8**

© БарГУ, 2016

Репозиторий БарГУ

# СЛОВА Ў МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ ЯК АБ'ЕКТ ФІЛАЛОГІІ І МЕТОДЫКІ (БЕЛАРУСКАЯ, РУСКАЯ МОВЫ)

УДК 37.015.3

**А. М. Гацко**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ЭЛЕМЕНТЫ ФАРМІРАВАННЯ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ Ў ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

**Уводзіны.** Асаблівасцю выкладання беларускай мовы ў сучаснай школе з'яўляецца камунікатыўная накіраванасць. Змест працы падпарадкаваны рэалізацыі задач моўнага, маўленчага і камунікатыўнага развіцця вучняў.

Праблема фарміравання камунікатыўнай кампетэнцыі, падпарадкавання ёй моўных, маўленчых уменняў, якімі авалодваюць вучні ў працэсе навучання мове, актыўна распрацоўваецца ў сучаснай беларускай і рускай лінгваметодыцы (Я. С. Антонава, А. У. Быстрова, Л. А. Мурына, В. Ф. Русецкі, М. П. Яленскі і інш.).

**Асноўная частка.** Пры арганізацыі навучання беларускай мове на камунікатыўна-дзейнаснай аснове вызначальным павінен выступаць прынцып фарміравання камунікатыўнай здольнасці ў суразмоўніцтве, для суразмоўніцтва і праз суразмоўніцтва [1]. Змест навучання мове ўключае камунікатыўна значымы матэрыял, на аснове якога адбываецца выпрацоўка арфаэпічных, акцэнталагічных, лексічных, граматычных, пунктуацыйных уменняў і навыкаў малодшых школьнікаў, а таксама авалоданне відамі маўленчай дзейнасці і правіламі суразмоўніцтва ў розных сацыяльных сферах.

Базавымі элементамі методыкі развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляюцца: фарміраванне матывацыі, практычная дзейнасць, самарэалізацыя, рэфлексія. На этапе матывацыі адбываецца ўсведамленне вучнямі адукацыйных задач і пабуджэнне да вучэбнай дзейнасці, звязанай з задавальненнем патрэб у практычным асваенні моўнага матэрыялу, неабходным для дасканалага валодання маўленнем. Да таго ж, на думку Я. І. Пасава, пры навучанні мове як сродку суразмоўніцтва неабходна гаварыць пра камунікатыўную матывацыю [2], бо матывы ўласцівыя любой іншай дзейнасці. Задача настаўніка на дадзеным этапе — сфарміраваць у вучняў патрэбу ў засваенні пэўнай лінгвістычнай тэмы, імкненне авалодаць камунікатыўна значымай нормай у прапанаванай вучэбнай камунікатыўнай сітуацыі. Асноўным метадам фарміравання матывацыі павінен стаць метад камунікатыўных стымулаў: слова настаўніка будзе змяшчаць пабуджальную і канстатавальную інфармацыю, якая будзе актуальнай, даступнай, зразумелай; стане элементам прыцягальнасці да вучэбнай работы і апорным матэрыялам пры стварэнні выказванняў вучэбна-навуковага стылю маўлення. На дадзеным этапе вучэбнай дзейнасці развіваюцца наступныя камунікатыўныя ўменні малодшых школьнікаў: прадуктыўная ацэнка вучэбнай камунікатыўнай сітуацыі; якаснае ўспрыманне інфармацыі, рэфлексійнае слуханне; арганізацыя маўлення ва ўмовах дзелавога суразмоўніцтва; падрыхтоўка вусных выказванняў навуковага стылю. Дадзены метад рэалізуецца праз выкарыстанне тэксту, што стварае «камунікатыўна-культурную прастору» заняткаў, якая дапаўняецца камунікатыўнымі сітуацыямі на наступных этапах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Практычная дзейнасць вучняў як базавая структура методыкі развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі грунтуецца на сістэме вучэбных дзеянняў, якія накіраваны на асэнсаванне і засваенне моўнага матэрыялу, фарміраванне маўленчых і камунікатыўных уменняў. На гэтым этапе адбываецца асэнсаванне сутнасці моўных з'яў, іх ролі ў маўленні, засваенне нормы ўжывання моўных сродкаў. Веды спрыяюць фарміраванню лексічных і сінтаксічных уменняў. У гэтых адносінах карыснымі будуць наступныя прыёмы: вызначэнне лексіка-граматычнага цэнтра вучэбнай камунікацыі, метад працы з маўленчымі ўзорамі, праспекцыя, інфармацыйна-вучэбны дыялог. У час вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ўвага вучняў можа быць прыцягнута да лексіка-граматычнага цэнтра (далей — ЛГЦ). Ён вызначаецца папярэдне і прапануецца ў гатовым варыянце або будуецца ў працэсе працы; ілюструе моўныя з'явы, моўныя законы (правілы), удакладняе лінгвістычную інфармацыю. З дапамогай ЛГЦ увага фіксуецца на спецыфічных лексічных і граматычных нормах беларускай мовы, што дапамагае засвоіць або актуалізаваць беларускамоўныя маўленчыя мадэлі. Так, ЛГЦ заняткаў будуць складаць лексічныя адзінкі, якія могуць выклікаць цяжкасці пры вызначэнні семантыкі, незнаёмыя словы, а таксама сінтаксічныя канструкцыі, што дэманструюць асаблівасці граматычнага ладу беларускай мовы.

Праспекцыя як спосаб папярэджання інфармацыі ў працэсе вучэбнай камунікацыі, што рэалізуецца пры дапамозе ілюстрацый да лінгвістычных правіл, апорных схем, алгарытмаў, пунктаў плана, спрыяе фарміраванню наступных камунікатыўна-інфармацыйных уменняў: разумець асноўную думку выказвання; разумець мэтавую ўстаноўку тэксту; структураваць інфармацыю; вылучаць праблемы, якія будуць закранацца ў час вучэбнай камунікацыі. Інфармацыйна-вучэбны дыялог як форма калектыўнай працы арганізуецца ў межах вывучэння пэўнай лінгвістычнай тэмы. Настаўнік фармулюе камунікатыўную задачу, выразна акрэслівае прадмет маўлення, вызначае тэму суразмоўніцтва, якая павінна быць зразумелай і актуальнай для вучняў. У час інфармацыйна-вучэбнага

© Гацко А. М., 2016



Репозиторий БарГУ

дыялогу школьнікі ствараюць выказванні на прапанаваную (у тым ліку і лінгвістычную) тэму, творча асэнсоўваюць яе, пры неабходнасці дабудоўваюць уласныя тэксты. Пры гэтым кожны можа выказваць свае думкі і меркаванні, карыстацца апорнымі словамі, канструкцыямі.

Такім чынам, на этапе практычнай вучэбнай дзейнасці вучні паступова авалодваюць неабходнай лінгвістычнай інфармацыяй, перапрацоўваюць вучэбны матэрыял. У працэсе працы ўвага засяроджваецца на граматычных і арфаэпічных узорах, якія ўключаюцца ў кантэкст вучэбных задач і арыентуюць не толькі на засваенне моўнай нормы, але і на яе актыўнае замацаванне праз рэпрэзентацыю ў розных сітуацыях маўлення.

Умовы вучэбнай камунікацыі спрыяюць актыўнай творчай самарэалізацыі школьнікаў, накіраванай на стварэнне вусных і пісьмовых выказванняў як падрыхтаваных, так і спантанных. У сістэму працы ўключаюцца заданні, якія маюць камунікатыўную вартасць. Яны накіраваны на фарміраванне ўласна камунікатыўных уменняў і навыкаў. З улікам сказанага прапануем метад камунікатыўна-крэатыўных практыкаванняў, які рэалізуецца праз такія прыёмы, як разгортванне тэматычнага сказа, абзаца тэксту, этыкетны дыялог, крэатыўныя рытарычныя гульні, прыём клішыравання фраз. З мэтай узмацніць выхаваўчы аспект навучання, засяродзіць увагу школьнікаў на спецыфічных формулах беларускамоўнага маўленчага этыкету выкарыстоўваецца прыём этыкетнага дыялогу. Этыкетныя нормы, нацыянальна маркіраваныя адзінкі маўленчай камунікацыі, як і нацыянальна абумоўленыя тэксты, павінны ўключацца ў змест заняткаў па беларускай мове на працягу ўсяго курса навучання. Прыём крэатыўных рытарычных гульняў фарміруе навыкі міжасобаснага і калектыўнага суразмоўніцтва, маўленчую мабільнасць, развівае памяць, увагу, цікавасць да прадмета. Гульня можа мадэляваць рэальна магчымую жыццёвую сітуацыю. Гульня як «арыфметыка сацыяльных адносін» (па Эльконіну) будзе найбольш дзейсным сродкам фарміравання камунікатыўных уменняў.

Асаблівую ўвагу пры распрацоўцы методыкі камунікатыўнай кампетэнцыі надаём рэфлексіі. Яна накіравана на вызначэнне вучнямі свайго ўзроўню валодання беларускай мовай.

**Заключэнне.** Развіццё элементаў камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў пачатковых класаў павінна адбывацца ў працэсе вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, якая мае камунікатыўна-крэатыўны характар. Адукацыйная прастора, у якой асноўнае месца адводзіцца вербальным сродкам навучання, арганічна дапаўняецца вучэбнымі сітуацыямі, якія актывізуюць моўныя і маўленчыя здольнасці, фарміруюць гатоўнасць да беларускамоўнай камунікацыі.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Что значит знать язык и владеть им / Н. М. Шанский [и др.]. Л., 1989. 192 с.
2. Пассов Е. И. Коммуникативный метод обучения иноязычному говорению. 2-е изд. М. : Просвещение, 1991. 223 с.

УДК 378.147.88:811.161.1'367

**Н. В. Ермалович**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

## ОРГАНИЗАЦИЯ УПРАВЛЯЕМОЙ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ В ПРОЦЕССЕ ИЗУЧЕНИЯ СИНТАКСИСА СЛОЖНОГО ПРЕДЛОЖЕНИЯ

**Введение.** Гуманитарные науки занимают особое место в подготовке учителей начальных классов. Будущие специалисты должны получить серьёзную лингвистическую подготовку, которая невозможна без глубоких и прочных знаний о структуре и свойствах русской языковой системы и закономерностях её функционирования в речи. Преподавание учебной дисциплины «Русский язык» актуально в условиях современной образовательной ситуации. Активное использование русского языка как одного из государственных языков, наряду с белорусским, во всех сферах общественной жизни выдвигает необходимость при подготовке специалиста с высшим образованием вооружить его необходимыми знаниями и сформировать необходимые умения для осуществления грамотного и эффективного общения в устной и письменной форме.

Важнейшая цель изучения дисциплины «Русский язык» — творческое осмысление студентами языковых фактов, познание закономерностей устройства языковой системы и особенностей её реализации в речи. Решение поставленных задач невозможно без повышения роли самостоятельной работы студентов над учебным материалом, усиления ответственности преподавателей за развитие навыков самостоятельной работы, воспитание потребности самостоятельного поиска знаний, стимулирование профессионального роста студентов.

**Основная часть.** Методологическую основу самостоятельной работы студентов составляет деятельностный подход, который заключается в том, что цели обучения ориентированы на формирование умений решать типовые и нетиповые задачи, т. е. на реальные ситуации, где студентам надо проявить знание конкретной дисциплины. Управляемая (контролируемая) самостоятельная работа студентов (далее — УСРС) — планируемая работа студентов, выполняемая по заданию и при методическом руководстве преподавателя, но без его непосредственного

© Ермалович Н. В., 2016



Репозиторий БарГУ